№ 7 ліпень 2011 г.

*О, Беларусь, мая шыпшына,*
*Зялёны ліст, чырвоны цвет!*
*У ветры дзікім не загінеш,*
*Чарнобылем не зарасцеш.*
***Ул. Дубоўка***

# Шыпшына

**Бюлетэнь Пастаўскай раённай арганізацыі**
**Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны**

***"Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор – мова."*** ***Алесь Разанаў***

## У ГЭТЫМ НУМАРЫ «ШЫПШЫНЫ»



**с. 2. - Нашы навіны пра беларускія справы**
**с. 3-4. - Краязнаўчая канферэнцыя ў Германавічах у карэспандэнцыі Зміцера Лупача і Ігара Пракаповіча**



**с. 5-6. - Зыгмунт Чаховіч - паўстанец, пакутнік, духоўны бацька Янкі Купалы у артыкуле Ігара Пракаповіча**



**с. 7. - Паэтычная старонка з Алінай Легастаевай, паэтэсай з Верацей, з нагоды юбілею**



**с. 8. - Легенда аб Дзявочай затоцы Камайскага возера ў запісе Алеся Гарбуля з куфра «Легенды і паданні нашага краю»**

# НАШЫ НАВІНЫ

***

Каманда сайта nastaunik.info сумесна з Таварыствам беларускай школы выдала два дыскі зборнікаў метадычных і дапаможных матэрыялаў для беларускамоўнага навучання дзяцей. Яны маюць назву «Гадуем беларусаў». Першая частка ўключае фільмы, песні, караоке, маляванкі і іншую інфармацыю для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў, другая разлічана на вучняў сярэдніх класаў. Дыскі можна бясплатна заказаць на сайце nastaunik.info, або замовіць у Пастаўскай раённай арганізацыі ТБМ.







***

Раённая газета "Пастаўскі край" пачала друкаваць гістарычнае даследаванне вядомага мясцовага краязнаўца Яўгена Чарэнкі "Логавінскія валокі" пра невялічкую вёску Логавінцы, што ляжыць недалёка ад Паставаў. Дарэчы, у нашым раёне ужо ёсць даволі грунтоўныя апісанні вёсак Міхнічы, Манькавічы, Груздава, Вайшкуны, Задзеўе, Лучай, Дунілавічы, Мягуны. І гэта радуе, бо ў іншых раёнах такога, бадай што, няма. Але ж вёсак ў нас больш за пяцьсот і ўсе яны з надзеяй чакаюць сваіх даследчыкаў.

***

Вынікі падпіскі на газету ТБМ "Наша слова" на трэці квартал 2011 года засведчылі невялікае зніжэнне колькасці чытачоў. Разам з тым, на Пастаўшчыне колькасць падпісчыкаў узрасла з 7 да 10. У Віцебскай вобласці больш прыхільнікаў "Наша слова" мае толькі ў Віцебску(21) і Наваполацку(17). Калі глядзець па ўсёй Беларусі, то акрамя абласных цэнтраў наш раён апярэджваюць Баранаічы(13), Пінск(12), Маладзечна(14), Дзятлава(15) і Ліда(11).

Сябры, каб ведаць пра справы Таварыства беларускай мовы, выпісвайце і чытайце газету "Наша слова"!

***

Сябры раённай арганізацыі ТБМ рыхтуюцца правесці ў канцы жніўня – пачатку верасня фальклорна-этнаграфічную экспедыцыю ва ўсходнюю частку Пастаўскага раёна з мэтай збору памятак даўніны. Удзельнікі спадзяюцца запісаць успаміны старажылаў пра мінулае жыццё-быццё, пачуць легенды, паданні ды проста цікавыя гісторыі пра тамтэйшыя мясціны, сабраць калекцыю даўнейшых прылад працы і побыту. Ну і карысна, і цікава правесці час у беларускамоўным сяброўскім асяродку.

***

24 ліпеня у філіяле Літаратурнага музея Максіма Багдановіча, што месціцца ў вёсцы Ракуцёўшчына пад Маладзечнам, прайшло рэспубліканскае свята паэзіі і песні "Ракуцёўскае лета – 2011". У ім удзельнічалі вядомыя беларускія пісьменнікі і выканаўцы.

# КРАЯЗНАЎЧАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ Ў ГЕРМАНАВІЧАХ





*Ада Райчонак*

У суботу, 16 ліпеня, у вёсцы Германавічы Шаркаўшчынскага раёна ў культурна-асветніцкім цэнтры імя Язэпа Драздовіча адбылася краязнаўчая канферэнцыя “Краязнаўчыя здабыткі краязнаўцаў Віцебшчыны за апошнія тры гады”.

У канферэнцыі прынялі ўдзел каля чатырох дзесяткаў чалавек, сярод якіх былі краязнаўцы з Глыбоччыны, Паставаў, Браслава, Мёраў, Лепеля,


*Удзельнікі канферэнцыі*

Шыпшына


Выступае краязнаўца Вітольд Ермалёнак

Шаркаўшчыны, прысутнічалі таксама госці з Мінска, Віцебска, Наваполацка, Вільні, Даўгаупілсу, Рэзэкне. Арганізатарам канферэнцыі выступіў культурна-асветніцкі цэнтр імя Язэпа Драздовіча, якім кіруе Ада Райчонак. Вёў канферэнцыю Антон Астаповіч, старшыня Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.


Выступае бард Зміцер Бартосік

Напачатку мерапрыемства адбылося адкрыццё выставы мастака Уладзіміра Кандрусевіча, а вядомы беларускі мастак Алесь Марачкін прэзентаваў свае апошнія творы. Потым удзельнікі наведалі мясцовы краязнаўчы музей, што месціцца ў былым палацы Шырына. Ён уражвае багаццем сваіх калекцый, асабліва тымі экспанатамі, якія звязаны з творчасцю Язэпа Драздовіча.


Выступае мастак Алесь Марачкін

Пасля гэтага пачалося чытанне дакладаў. Удзельнікі канферэнцыі мелі магчымасць пазнаёміцца з вельмі цікавымі паведамленнямі пра апошнія знаходкі краязнаўцаў Падзісеншчыны

Перад удзельнікамі імпрэзы выступілі барды Таццяна Беланогая і Зміцер Бартосік,


Дыванок Язэпа Драздовіча

а таксама маладая авангардная паэтка Анка Упала. Канферэнцыя была прысвечана памяці краязнаўцы, гісторыка, этнографа Міхася Райчонка, які пражыў толькі 26 гадоў, але шмат зрабіў для захавання культурнай спадчыны Дзісенскага краю.

*Зміцер Лупач, Ігар Пракаповіч*
*Фота Ігара Пракаповіча*

# ЗЫГМУНТ ЧАХОВІЧ - ПАЎСТАНЕЦ, ПАКУТНІК, ДУХОЎНЫ БАЦЬКА ЯНКІ КУПАЛЫ

Пастаўшчына можа ганарыцца тым, што на ёй нарадзіўся чалавек, які зрабіў вялікі, можна сказаць нават, лёсавызначальны ўплыў на жыццёвы шлях і фарміраванне таленту класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы. Гэта асоба – шляхціц, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863 года пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага, ураджэнец маёнтка Сурвілішкі Зыгмунт Чаховіч.

Радавод Чаховічаў пачынаецца з XVI стагоддзя. Вядома, што адной з ліній роду належаў маёнтак Мацкоўцы на Пастаўшчыне, якім род валодаў з 1741 г., атрымаўшы яго ад Сулістроўскіх. Зараз у нашым раёне паселішча з такой назвай няма, але можна меркаваць, што маёнтак знаходзіўся на месцы сучаснай вёскі Мацковічы, якая ляжыць на поўнач ад Камаяў. Пра тое, што там існаваў сядзібны комплекс, нагадвае нетыповая для вясковых паселішчаў планіроўка і сістэма моцна зарослых штучных ставоў.

Зыгмунт (Сігізмунд) Бярнардавіч Чаховіч-Ляхавіцкі (1831-1907), нарадзіўся ў Сурвілішках, дзе тады на ўзгорку паміж Вялікім і Малым Сурвілішскімі азёрамі знаходзіўся маёнтак Чаховічаў. Пачатковую адукацыю, напэўна, атрымаў дома, а потым вучыўся ў Віленскім дваранскім інстытуце, які закончыў у 1851 годзе ва ўзросце 20 гадоў. Пасля паступіў у Пецярбургскі універсітэт, дзе ў асяродку патрыятычна настроенай моладзі прасякся ідэямі незалежнасці і вальнадумства, стаў прыхільнікам дэмакратычных поглядаў на дзяржаўнае будаўніцтва. Гэта зблізіла яго з К. Каліноўскім і іншымі аднадумцамі. Ужо ў 1861 годзе ў Камаях ён быў заўважаны ўладамі як ініцыятар антыўрадавых дэманстрацый. У 1862-63 гадах Зыгмунт уваходзіў у склад Літоўскага правінцыйнага камітэта, актыўна ўдзельнічаў у падрыхтоўцы паўстання у складзе групы "чырвоных", быў адным з яго кіраўнікоў. Чаховіч з'яўляўся блізкім



З.Б.Чаховіч.

сябрам Кастуся Каліноўскага.

Пасля ліквідацыі камітэта Зыгмунт - «экспедытар» віленскага паўстанцкага цэнтра: да яго сыходзіліся ўсе канспіратыўныя сувязі. Ён трымаў у памяці ўсе прозвішчы, адрасы і яўкі, кіраваў зносінамі з мясцовымі падпольнымі арганізацыямі Літвы і Беларусі.

Пасля паразы паўстання Зыгмунт Чаховіч быў арыштаваны 31 ліпеня 1863 года і прысуджаны да растрэлу. Але прысуд «Казнить смертью расстрелянием" генерал-губернатар Мураўёў па просьбе Канстанціна Радзівіла замяніў на 12 гадоў катаргі ў самых цяжкіх капальнях – сібірскіх Нерчынскіх рудніках. У час паўстання і адбываючы пакаранне З. Чаховіч трымаўся годна і высакародна. Вось як успамінае пра яго ўдзельнік паўстання Якуб Гейштор: "Ён [З. Чаховіч] адказваў за ўнутраную перапіску з ваяводствамі, атрымліваў паперы, перадаваў іх нам і ў той жа час рассылаў нашы. З поўнай аддачай, самаахвярна і

добрасумленна выконваў свой абавязак; пазней у следчай камісіі, па дарозе ў Сібір і ў ссылцы ён паказаў сябе сумленным чалавекам і гарачым патрыётам. Да інтрыг ніколі не далучаўся; для яго важней быў дабрабыт радзімы, а не дробныя амбіцыі".

Каля 1880 г. Зыгмунт Чаховіч вярнуўся пасля ссылкі ў Беларусь і пасяліўся на сталае жыццё ў маёнтку Малыя Бясяды каля Радашковічаў. Тут ён жыў, зусім не займаючыся гаспадаркай, толькі сваімі кнігамі. Лёс склаўся так, што ў суседнім фальварку Селішча на той час арандаваў зямлю Луцэвіч, у якога быў сын-падлетак Янка - у будучым вядомейшы паэт Янка Купала. Дык вось, Янка раззнаёміўся з былым паўстанцам і часта наведваўся да яго, каб пагаварыць ды узяць для чытання колькі кніг з багатай бібліятэкі Чаховіча. Купала так характарызаваў гэтага чалавека: „...Памешчык быў ідэаліст, летуценнік... Жыў асобна, куды яму пасылалася ежа, ні з кім не сустракаўся, заўсёды заняты кнігамі». Пра сябе ў той час паэт напісаў: «...У бібліятэцы Чаховіча было шмат прагрэсіўных кніг, якія дапамаглі мне асэнсаваць палітычны лад тагачаснай царскай Расіі і абуджалі незадаволенне гэтым ладам....» І яшчэ: „Дарэчы, я ўспомню тут адну акалічнасць: калі мы жылі ў Селішчы, я пазнаёміўся з адным польскім памешчыкам Сігізмундам Чаховічам у маёнтку Малыя Бясяды Вілейскага павета. Памешчык гэты быў у свой час сасланы Мураўёвым у Сібір, але з цягам часу вярнуўся і жыў бязвыезна ў сваім маёнтку Бясяды. У яго была велізарная бібліятэка, большасцю з польскіх кніг. Вось тут мне і адкрыўся, што называецца, скарб... Яго бібліятэка адкрыла мне вочы на многае, што дагэтуль было невядома. Бываючы ў яго часта, прыносячы яму ў падзяку за кнігі то масла, то сыр, бо таго, што даставалася яму ад жонкі, на пражытак не хапала, гутарылі з ім шмат аб чым, аб чым - цяжка нават успомніць, але больш за ўсё, здаецца, аб польскім паўстанні 1863 года. Часта ён мне выбіраў кнігі для чытання, а іншы раз я сам прасіў такіх або іншых аўтараў. Апрача ўсякага роду паэзіі, якой я больш за ўсё захапляўся, белетрыстыкі, гісторыі і да т. п., у яго першага я пазнаёміўся з нелегальнай літаратурай, больш за ўсё наконт польскага паўстання. Былі гэта выданні кракаўскія, лонданскія, парыжскія і г. д.».

Так сталася, што ўласныя маёнткі З. Чаховіча Мацкоўцы, Крашаны, канфіскаваныя пасля арышту, былі прададзеныя ў 1875 г. за даўгі. Зыгмунт не знайшоў паразумення з гаспадыняй маёнтка, жонкай Анэляй Арамовіч, з якой ажаніўся яшчэ перад паўстаннем у 1859 годзе, і застаўся без сродкаў. У Бесядах ён знаходзіўся хутчэй як кватарант, да таго ж паўлегальна, паколькі ўрад не даў афіцыйнага дазволу на пражыванне.

У канцы жыцця, пасля смерці жонкі, Зыгмунд Чаховіч становіцца ўладальнікам маёнтка. З атрыманай спадчыны ён першым чынам выплаціў вялікія даўгі і пазыкі, узятыя калісьці на паўстанцкія мэты. Зрабіў гэта свядома, нягледзячы на тое, што спаўна за ўсё даўно выплаціў сваім здароўем і жыццём.

Зыгмунт Чаховіч памёр 15 кастрычніка 1907 года. Біяграфічныя звесткі жыцця і дзейнасці Зыгмунта Чаховіча даюць нам усе падставы далучыць гэтага чалавека да шэрагу выдатных асоб Пастаўшчыны. Яго высакароднасць, патрыятызм, прага незалежнасці і справядлівасці, сумленнасць у дачыненні да сябе, сваіх поглядаў, сваіх сяброў – вось тыя станоўчыя якасці, якія могуць служыць узорам у выхаванні сапраўдных патрыётаў незалежнай Беларусі.

Асоба З. Чаховіча натхніла яшчэ аднаго класіка беларускай літаратуры Уладзіміра Караткевіча. Вобраз гэтага неардынарнага чалавека адлюстраваны ў яго п'есе "Калыска чатырох чараўніц", у якой паказаны вялікі ўплыў З. Чаховіча на фарміраванне светапогляду Янкі Купалы.

*Ігар Пракаповіч*

# «ПАЭЗІЯ - ГОСЦЯ НЯБЕСНАЯ...»



**Легастаева Аліна Антонаўна**, беларуская паэтэса. Нарадзілася 27. 07. 1941г. у в. Верацеі Пастаўскага раёна. Закончыла Крулеўшчынскую сярэднюю школу і Віцебскі педагагічны інстытут. Больш 20 гадоў жыла ў Літве, пяць гадоў працавала на БАМе. У 1992 годзе вярнулася на радзіму.

Аўтар зборнікаў паэзіі "Яшчэ да Евы я жыла"(1998), "На вертикали сердца"(1999), "Позніх кветак святло"(2006).

Жыве ў Мінску.

*Зарастае панадворак*
*Падарожніку травой.*
*У акенцах летні морак*
*Дрэмле шэраю савой.*

*Веюць смуткам ад парога*
*Апусцелыя вуглы,*
*І шчымліваю аблогай*
*Цісне сэрца жаль стары.*

*Радасць тут скарала гора,*
*У труну лягла любоў.*
*За матуляй тата скора*
*Млечным Шляхам адышоў.*

*Але ўсё грыміць чыгунка*
*Падкаванасцю каня,*
*І гітарай сямиструннай*
*Шклянкі на стале звіняць.*

*Ноччу мята лугавая*
*Лёгкім водарам дыміць,*
*А з партрэта, як святая,*
*Мама ў вочы мне глядзіць*

*Хто мы?*
*Куды мы?*
*Адкуль мы?*
*Навошта?*
*Носіць адказ жураўліная пошта.*
*У небе высокім клёкат вясновы —*
*Чуюць усе таямнічыя словы.*
*Толькі аб чым — зразумець —*
*і пра што*
*Дваццаць стагоддзяў не можа*
*ніхто.*
*Птушкі да неба. Людзі — да волі,*
*Той, што як ветрык гайдаецца ў*
*голлі.*
*Б'ецца у шыбы раз'юшаны час —*
*Ён улагодзіць ці вынішчыць нас?*
*Век адлятае, горкі і дымны,*
*Хто мы?*
*Навошта?*
*Адкуль мы?*
*Куды мы?*

# ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ НАШАГА КРАЮ

## АБ ДЗЯВОЧАЙ ЗАТОЦЫ КАМАЙСКАГА ВОЗЕРА

Гэта гісторыя адбылася яшчэ пры цары. Працавалі ў мясцовага пана парабкамі маладыя хлопец і дзяўчына. І такое каханне ў іх было, што людзі, нават, прымаўкі жартаўлівыя аб гэтай неразлучнай пары складалі. Кажуць, што і дня не маглі адзін без другога пражыць.

І ўсё б было добра, справа ішла да вяселля, каб ні мясцовы пан
іх гаспадар. Маладосць
прыгажосць той дзяўчын
спакусіла пана на злачынства

Па агульнай змове
бандытамі, адправіў пан тог
парабка аж у Лынтуп
прадаць цяля. Пакуль хлопе
дабраўся ў далёкае мястэчка
пакуль змог прадаць п
больш-менш падыходзячам
кошту тую цялушку
панскага статка, дык і нядоў



кастрычніцкі дзень падыйшоў да свайго скончэння. Ужо пасля Радуты хлопца ахінула цёмная восеньская ноч. Імжыў дождж, у цемры і цішыні гэтай непрагляднай ночы ўсё жывое пахавалася ў свае сховішчы ад невыноснай вільгаці і зімноцця. Толькі чаўканне па набракшай ад вады дарозе лапцяў адзінокага падарожніка гулка адгукалася ў цягучым густым паветры. Мусі лепшага часу да злачынцаў і не прыдумаеш. Так і адбылося, як задумалі пан і бандыты. На другі дзень знайшлі тога парабка недалёка ад Лодасяў на дарозе забітым і абрабаваным.

Не магчыма перадаць, як гаравала аб сваім каханым яго дзяўчына. Людзі самі, гледзячы на яе, лілі горкія слёзы.

А крывадушны пан не пасаромеўся сам прыйсці ў хату бацькоў той дзяўчыны. Бацькам сказаў, што вельмі ўзрушаны горам, моцна шкадуе яе і, каб суцешыць яе боль, забірае іх дачку да сябе ў палац.

Зашчымілі у нядобрым прадчуванні сэрцы бацькоў, ды што з панам зробіш. Пры цары кожны пан у сваіх уладаннях быў і царом і богам, не тое, што ў старажытныя вольныя часы.

Калі ж дзяўчына апынулася ў поўнай уладзе пана, той пачаў дамагацца яе цела. У панскім палацы не было каму заступіцца за бедную парабчанку. Не дабром, дык сілай узяў бы яе пан. Таму і сказала дзяўчына сваёму кату, што як усе заснуць, сама прыдзе ў ложак да яго.

Але дарэмна чакаў яе пан усю ноч. Дзяўчына, як усе ляглі спаць, патаемна вылезла ў акно і пабегла да берага Камайскага возера, дзе раней сустракалася са сваім каханым.

Доўга плакала яна там аб сваім каханым, аб сваёй гаротнай долі. А пасля ўстала і са словамі "Калі не ты, мой любы, дык ніхто мяне не возьме!" кінулася ў чорную сцюдзёную ваду.

З той пары і завецца гэта месца Дзявочай затокай. Людзі кажуць, што да цяперашняга часу ў поўнамесячныя ночы даносяцца з вады стогны той парабчанкі. І калі хто пачуе той стогн, то хутка развітаецца са сваім каханым ці каханай.

*Запісаў Алесь Гарбуль*

*Малюнак Наталлі Зямчонак*



**Шыпшына**

*Выданне Пастаўскай раённай арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны*

Адказны за нумар: Ігар Пракаповіч

Адрас: 211875, горад Паставы, вул. Паркавая, 52. Тэл.: 02155-4-44-75

Вёрстка: Ігар Пракаповіч

*Рэдакцыя можа не падзяляць думкі аўтараў друкаваных матэрыялаў*

*Надрукавана на абсталяванні сяброў, распаўсюджваецца дарма*

*Наклад 100 асобнікаў*